# Рэгіянальны краязнаўчы кампанент у сістэме адукацыйнага працэсу

Л.И.Казак, директор Ельской районной гимназии

Г.В.Лопорт, учитель белорусского языка и литературы Ельской районной гимназии

Галоўным арыенцірам сучаснай адукацыі з’яўляецца умацаванне грамадзянскай пазіцыі моладзі. “Кіраўніцтвам краіны неаднаразова падкрэслівалася, што ідэалогія беларускай дзяржавы грунтуецца на любові да сваёй зямлі, павазе да людзей і гонары за сваё» [1].

На сучасным этапе тэма краязнаўства з’яўляецца дзейсным сродкам выхавання падрастаючага пакалення. Праз далучэнне да гістарычнага мінулага, гістарычнай спадчыны, вытокаў еднасці з роднымі каранямі, да ўзораў жыцця славутых землякоў адбываецца фарміраванне асобы. Праз мясцовы патрыятызм выхоўваецца бачанне тых сувязяў, якія аб’ядноўваюць народ. С. Рубінштэйн, псіхолаг і філосаф, сцвярджаў, што трэба звязаць нашага навучэнца тысячамі ніцей з жыццём, каб у яго не ўтварылася душэўная пустата… Сапраўды, разбурэнне сістэмы традыцыйных каштоўнасцей, адсутнасць выразных духоўных арыенціраў, пераасэнсаванне культуры небяспечны. Грамадства адчувае гэту небяспеку. Настаўнікі асабліва. Краязнаўства здольнае сфарміраваць у вучняў грамадзянскія і маральныя якасці. Гэта і з’явілася асноўнай задачай пры стварэнні электроннай кнігі “Радзімазнаўства. Ельшчына”.

Наш праект ствараўся разам з вучнямі і для вучняў, дзеля абуджэння ў іх цікавасці да роднай Ельшчыны, паглыблення ведаў пра гэты самабытны куточак Беларусі, далучэння да вывучэння багацця матэрыяльнай і духоўнай спадчыны раёна…

Знаёмства з кнігай адбываецца ў форме завочнага падарожжа. Інфармацыя змешчана ў раздзелах “З гісторыі Ельшчыны”, “Славутыя землякі”, “З памяццю ў сэрцы”, “Чарнобыльскі вецер”, “Маршрутамі роднага

краю”, “Культурная спадчына”, “Ельшчыне любімай прысвячаю”. Гэта не проста кніга — гэта ўнікальны летапіс раёна, змешчаны на 102 старонках. У дадатку прадстаўлены даследчыя працы вучняў, прэзентацыі, сцэнарыі свят, творчыя работы, напрацоўкі акцый… Намаганнямі настаўнікаў і вучняў гімназіі сабраны багаты, змястоўны мясцовы матэрыял. І сёння гэта цудоўная настольная кніга для педагогаў у выхаванні сапраўднага грамадзяніна.

Як выкарыстоўваецца рэгіянальны краязнаўчы кампанент у адукацыйным працэсе?

Выхаванне любові да малой радзімы прасочваецца асабліва глыбока на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Фарміраванне моўных, маўленчых і камунікатыўных уменняў школьнікаў адбываецца праз тэкстацэнтрычны падыход, тэкставы матэрыял электроннай кнігі: “Славутыя землякі”, “З гісторыі Ельшчыны”, “Жамчужына майго мястэчка”, “Брэнды Ельшчыны”, “Вуліцы горада”, “З памяццю ў сэрцы”, “Культурная спадчына”, “Духоўная спадчына”, “Сцежкамі роднага краю”, “З гісторыі вёсак” і інш. Гучыць вусны і пісьмовы пераказ тэкстаў, аналізуюцца сказы, выконваюцца творчыя заданні, праводзяцца моўныя разборы, моўныя доследы, лексічныя хвілінкі і г. д. Матэрыял кнігі выкарыстоўваецца для напісання розных відаў дыктантаў. Пры вывучэнні фанетыкі, марфемікі, словаўтварэння для разбораў прапаноўваюцца словы-тапонімы, мікратапонімы, тлумачыцца іх паходжанне. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Агульныя і ўласныя назоўнікі” вучні самастойна працуюць над складаннем слоўнікаў на краязнаўчым матэрыяле электроннай кнігі. Вёскі, урочышчы, вуліцы… Усё мае сваё цікавае імя, і дзеці з захапленнем выконваюць такія заданні.

Пашырыць слоўнікавы лексічны запас вучняў дапамагае выкарыстанне на ўроках рубрыкі “Гаваркое слова”, дзе разглядаюцца самабытныя словы, характэрныя для нашай мясцовасці.

Настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры практыкуюцца тэматычна-лексічныя ўрокі. Напрыклад, “Складаны бяззлучнікавы сказ. Традыцыйныя святы Ельшчыны”, “Міхась Лынькоў “Васількі”. Трагічная статыстыка вайны

на матэрыяле Ельскага раёна”, “Янка Брыль “Memento mori”. Спаленыя вёскі Ельскага раёна” і інш..

На ўроках беларускай мовы і літаратуры праводзяцца этнаграфічныя хвілінкі з мэтай выхавання пачуцця любові да роднай зямлі. Ладзяцца конкурсы чытальнікаў “Ельшчыне любімай прысвячаю”, “Першы творчы радок”.

Безумоўна, краязнаўчы матэрыял на ўроку і па-за ім павышае цікавасць да прадмета, абуджае жаданне пошукавай і даследчай дзейнасці, да пазнання роднага краю. Так, у электронным дадатку да кнігі “Радзімазнаўства. Ельшчына” змешчаны даследчыя работы вучняў гімназіі, якія бралі ўдзел у конкурсах розных узроўняў. Даследчыя работы “Брэнды Ельскага раёна”, “Назвы родныя роднай зямлі” – пераможцы раённага этапу рэспубліканскага конкурсу краязнаўчых работ у намінацыях “Гісторыя роднага краю” і “Культурная спадчына”. “Айконімы Ельскага раёна”, “Ельскі ручнік”, “Славутыя землякі”, “Культурны код нацыі” – пераможцы раённага этапу вучэбна-даследчай канферэнцыі “Пошук” і міжнародных літаратурна-гістарычных чытанняў, што праводзяцца ў ДУА “Гімназія г. Лунінца”, прысвечаных памяці нашага земляка М. П. Анцукевіча. З работамі краязнаўчага характару гімназісты штогод выступаюць на Свята-Іаанаўскіх чытаннях “Вечныя каштоўнасці”, якія праводзяцца ў гімназіі з 2011 года.

Павышэнню нацыянальнай самасвядомасці вучняў спрыяе выкарыстанне матэрыялаў электроннай кнігі на ўроках гісторыі. Пры вывучэнні падзей Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі, тэмы “Жывапіс і архітэктура Беларусі” даюцца апераджальныя заданні краязнаўчага характару па адпаведнай тэме. Праводзяцца віртуальныя падарожжы па Ельшчыне, выкарыстоўваецца матэрыял электроннага дадатку. Звесткі, сабраныя ў кнізе, – аснова для інтэлектуальнай гульні “Гомельшчына. Ельшчына”, якая была распрацавана настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства Ельскай раённай гімназіі.

Увесь сабраны краязнаўчы даследчы матэрыял шырока выкарыстоўваецца ў пазакласнай выхаваўчай рабоце. Тэматычныя прэзентацыі, урокі памяці, урокі ад вэтэранаў…

Да Дня Перамогі ў гімназіі яшчэ ў 2015 годзе стартаваў праект “Жывыя галасы сведкаў вайны”, мэтай якога было сабраць відэаматэрыял успамінаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны ад ветэранаў Ельшчыны. Гэты ўнікальны набытак – сумесная праца вучняў гімназіі і класных кіраўнікоў. І сёння гэта не проста ўспамін, а дзейсны сродак выхавання пачуцця патрыятызму праз гістарычную памяць і даніна павагі тым, хто каваў Вялікую Перамогу. Відэаматэрыял  выкарыстоўваецца на класных гадзінах. У гэтым годзе створана віртуальная гасцінная “З памяццю ў сэрцы”, асновай якой таксама з’яўляўляецца рэгіянальны матэрыял.

Ва ўстанове адукацыі ўсё працуе на выхаванне асобы вучня, у тым ліку і інфармацыйная прастора. Дарэчы, па выніках працы над электроннай кнігай распрацаваны і аформлены стэндавы матэрыял “З памяццю ў сэрцы”, “Ельшчына любімая мая”, “Брэнды Ельскага раёна”. Вучні старэйшых класаў праводзяць экскурсіі для гімназістаў і гасцей установы адукацыі.

Электронная кніга “Радзімазнаўства. Ельшчына” як адзін са сродкаў вывучэння гісторыі малой радзімы  была прадстаўлена на конкурс навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці моладзі. І на абласным, і на рэспубліканскім узроўні адзначана дыпломамі І ступені.

Краязнаўчы матэрыял – невычэрпная крыніца каштоўнасцей для выхавання дзіцяці. На цудоўнай спадчыне роднай зямлі ўзрошчваецца душа. Бо, як гаворыць народная мудрасць, чаму навучыліся ў гняздзе, тое і будзе ў палёце.

Літаратура

1. Кузьміч, В. Рэгіянальны патрыятызм як кампанент грамадзянскага выхавання / В.Кузьміч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elib.belstu.by/bitstream/123456789/19853/1/44kuzmch-v.-a.-rehgyanalny-patryyatyzm-yak-kampanent-gr

2. Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Ельскі раён / Мінск: Ураджай, 2001. – 487 с.